ДУК Д.У. (НАВАПОЛАЦК), САЛАЎЁЎ А.А. (ПОЛАЦК)

# НОВЫЯ ЗНАХОДКІ РЭНЕСАНСНАЙ КАФЛІ Ў ПОЛАЦКУ (ДА ПЫТАННЯ АБ САЦЫЯТАПАГРАФІЧНАЙ СТРУКТУРЫ ЗАПАЛОЦКАГА ПАСАДА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.).

Вынікі археалагічнага вывучэння Запалоцкага пасада апошніх гадоў значна ўзбагацілі ўяўленне сучаснікаў пра Полацк XI–XVI стст. [2; 3]. Падчас археалагічнага нагляду 2006 г. былі атрыманы новыя дадзеныя па гісторыі Запалоцкага пасада. У артыкуле прапануецца аналіз рэчавага матэрыялу (рэнесанснай кафлі) і яго інтарпрытацыя ў кантэксце развіцця сацыятапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада.

Летам 2006 г. уласнікам сядзібы па вул. Краснова, д. 12 у Запалоцці праводзілася будаўніцтва калодзежа пад каналізацыю (мал. 1). Дзеля гэтага бетонныя кольцы дыяметрам 2 м укопваліся шляхам выбаркі зямлі знутры. Ад калодзежа да дома № 12 пракладзена траншэя на даўжыню каля 2 м, шырынёй 0,5 м. Глыбіня траншэі да 0,7 м, калодзежа – 2,5 м. Культурны пласт траншэі мае баластны характар, пераважна гэта будаўнічы друз XX ст. Тое ж тычыцца запаўнення калодзежа да глыбіні 1,5 м. Ніжэй глыбіні 1,5 м зафіксаваны пласт, які мае гістарычную каштоўнасць. Мацярык не быў адкрыты, што сведчыць пра яго заляганне на значнай глыбіні, прынамсі, больш 2,5 м. Не выключана, што магутнасць культурнага пласта на даследаваным участку значна большая за 3 м.

Падчас работ у культурным пласце, які залягаў на глыбіні 1,5–2,5 м, было знойдзена шмат кавалкаў гаршковай, міскавай і каробкавай кафлі. Усе кавалкі – тэракотавыя. Яны знойдзены ў зямлі, вынутай з траншэі пад калодзеж з глыбіні 1,8–2,2 м ад узроўню дзённай паверхні. Рэшткаў печы падчас даследавання культурнага пласта ў самім калодзежы не выяўлена, магчыма яна размяшчалася па-за яго межамі. Культурны пласт, у якім знойдзена кафля, шэры, камкаваты, у ім трапляюцца кавалкі чырвонай абпаленай гліны (характэрная прыкмета культурных пластоў XVI–XVIII стст.). Разам з кафляй знойдзены вялікі кавалак макоры і некалькі абломкаў чорналашчонай керамікі. Сярод начыння былі вырабы, зробленыя на ручным і нажным ганчарным крузе.

Уся знойдзеная кафля мае чырвоны або карычневы колер чарапка. Форма вусцяў гаршковай кафлі круглая, чатырохпялёсткавая і квадратная (мал. 2: 4–7). Сабраны поўны профіль гаршковай кафлі з круглым вусцем. Яе вышыня 16,5 см, дыяметр донца і венца адпаведна 8 і 14 см. Гэта кафля, як і вырабы з чатырохпялёсткавым вусцем, маюць дамешкі пяску і жарствы ў керамічным цесце. Чарапок на зломе трохслойны, зярністы. Гэтыя вырабы адфармаваны на ручным ганчарным крузе. Падобная кафля знойдзена М.В. Клімавым на помніку Лучна-1 падчас вывучэння феадальнай сядзібы, якая загінула ў пачатку XVI ст. [7, с. 148–149]. Асаблівасцю кафлі з квадрыфольным вусцем, знойдзенай на Запалоцці, з'яўляецца наяўнасць невысокага борціка. Падобны канструктыўны элемент прысутнічаў на кафле з печы XV ст., раскапанай на паўночнай частцы Запалоцкага пасада ў 2003 г. [3, мал. 4]. Борцікі донца, як і буйная жарства ў керамічным цесце, павінны былі захоўваць кафлю ад прамога ўздзеяння агню пры паленні печы.

Кафля з квадратным вусцем адрознівалася загладжанымі тонкімі сценкамі. Іх таўшчыня вагаецца ў межах 0,5–0,7 см. Керамічнае цеста тлустае, мае дамешкі пяску. Абпал раўнамерны. Некаторыя вырабы маюць гарызантальныя палоскі на вонкавым баку сценак. Высокая якасць апрацоўкі сценак сведчыць пра выкарыстанне нажнога круга і тэхнікі абточвання падчас фармоўкі.

Каробкавая кафля прадстаўлена абломкамі сценавых і карнізных вырабаў (мал. 2: 1–3; мал. 3). Знойдзена таксама і кафля–навершша (мал. 4). Вонкавыя пласціны сценавай кафлі квадратныя, з сегментападобнай круглай сярэдзінай. Частка з іх мела трохкутнікі па вуглах (мал. 3: 5). Памеры пласцін 15,5 х 15,5 см. Таўшчыня пласцін вагалася ў межах 0,5–1 см. Аналагі падобнай кафлі ёсць у Заслаўлі, дзе яны датаваны XVI – пачаткам XVII стст., але ў адрозненні ад полацкіх знаходак памеры заслаўскіх пласцін былі значна большыя – 20х20 см [6, с. 39].

Кафля з Запалоцця мела цыліндрычныя румпы, на асобных румпах нанесены малюнак у выглядзе кратаў (мал. 3: 1). Румпы адступалі ад края пласціны на 1,5–2,0 см. Знойдзены фрагмент верхняй частцы румпы з сеткавым арнаментам. Вусце румпаў было квадратным ў выглядзе нешырокага раструба з гарызанатальна зрэзаным краем венца. Такім чынам, вышыня румпы разам з пласцінай кафлі была каля 11 см. Знойдзеная кафля мела невыразныя сляды нагару з унутранага боку пласціны.

Уяўляе цікавасць адзін кавалак пласціны з выявай чалавека (магчыма, скамароха?). Выява



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выканана у тэхніцы гарэльефа (мал. 3: 2). Падобная па тэхніцы выканання кафля была знойдзена на Верхнім замку Полацка і датавана першай паловай XVI ст. [5, с. 170]. Кафля гэтага тыпу ўжо мела рамку па контуру вонкавай пласціны. Сярод геаметрычных арнаментаў гэтай кафлі пераважаюць выявы трохкутнікаў і паўсферы (сегмента).

Карнізная кафля прадстаўлена кавалкамі пласцін з арнаментам у выглядзе ліній і геамстрычных фігур (мал. 2: 1–3). Таўшчыня пласцін кафлі 0,5–1 см. Такі арнамент добра вядомы па т. зв. праразной кафле, дзе дэкаратыўная рашотка заглыблена ад узроўню краёў кафлі. Для вытворчасці знойдзеных у Запалоцці пласцін была ўжыта драўляная форма з люстэркавай выявай арнамента (мал. 2: 2, 3).

Асобна вылучаецца фрагмент кафлі, якую можна лічыць каронкай (мал. 4). Па складу цеста і тэхналогіі апрацоўкі румпы гэты выраб вельмі падобны на вышэй згаданыя гаршковыя кафлі з круглым і чатырохпялёсткавым вусцем. З бакоў і знізу кафля мела шырокую рамку з геаметрычным арнаментам. У цэнтры пласціны размешчаны геральдычны шчыт з манаграмай ў выглядзе пераплеценых лацінскіх літар – M, A, A, R, I. Парадак размяшчэння літар падпарадкаваны кампазіцыі малюнка. Літары А маюць перакрыжжа. Зыходзячы са складу літар можна меркаваць, што гэта – адлюстраванне манаграмы Божай Маці [8, с. 255]. Над шчытом змешчана мяркуемая выява паўмесяца. Вядома, што ў хрысціянстве паўмесяц таксама з'яўляецца адным з сімвалаў Багародзіцы, асабліва часта ён сустракаецца на каталіцкіх іконах. На гэтай кафле паўмесяц звернуты рогамі ўніз. Падобная выява паўмесяца вядома на гравюры 1513 г. Балдунга Грыена, выява сімвалізуе мужчынскі пачатак [8, с. 57, 132].

Датаванне ўсяго знойдзенага набора кафлі ўкладаецца ў храналагічны дыяпазон канца XV – першай паловы XVI стст. Зыходзячы з канструкцыі кафлі можна меркаваць, што печ была двух'яруснай і, магчыма, мела цыліндрычную форму. Пра гэта сведчыць адсутнасць фрагментаў вуглавой кафлі і цэглы для іх муроўкі. Ніжняя частка печы мела ў сваім складзе гаршковыя кафлі, верхняя – каробкавыя.

Такім чынам, падчас археалагічнага нагляду ў Запалоцці быў знойдзены кафляны набор, верагодна, ад адной печы. Гэтая печ існавала ў першай палове XVI ст. Можна меркаваць, што печ была двух'ярусгай, мела цыліндрычную аснову з гаршковай кафлі і надставу, якая складалася з каробкавай кафлі. Раней прыкметы існавання печаў з цыліндрычнай надставай, да таго ж зробленай з каробкавай кафлі, былі адкрыты на Верхнім замку Полацка – традыцыйным месцы пражывання полацкага набілітэту [5, с. 168]. У святле новых дадзеных можна ўпэўнена сцвярджаць, што ва ўсходняй частцы Запалоцкага пасада размяшчалася сядзіба заможнага гараджаніна, магчыма, каталіцкага святара. Гэта ўжо не першае археалагічнае адкрыццё такога кшталту, зробленае за апошнія гады. У 2003 г. была адкрыта феадальная сядзіба ў паўночна-ўсходняй частцы Запалоцкага пасада, якая, верагодна, таксама мае прамое дачыненне да вернікаў каталіцкага веравызнання [3, с. 104–105].

Як новая знаходка можа быць інтэрпрытавана ў кантэксце вывучэння гісторыі развіцця сацыятапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада першай паловы XVI ст.? Адказ на гэтае пытанне бачыцца наступным.

Сукупнасць археалагічных і пісьмовых крыніц дазваляе выказаць меркаванне, што ў Полацку першай паловы XVI ст. існавалі два асноўных горадаўтвараючых пасада – Вялікі і Запалоцкі. Гэтыя пасады размяшчаліся на правым беразе Дзвіны, Запалоцкі – на захад ад вусця Палаты, Вялікі – на ўсход ад Верхняга замка. Абодва пасада былі ўмацаваны. Плошча Вялікага пасада заставалася практычна нязменнай на працягу ўсяго разглядаемага перыяду і складала каля 50 га, межы Запалоцкага пасада істотна вагаліся ў бок скарачэння, што было звязана з частымі войнамі з Маскоўскім княствам. Паводле дадзеных пісьмовых крыніц, Запалоцкі пасад у 1533 г. зведаў значнае скарачэнне плошчы ў выніку аблогі татарамі і маскоўскімі войскамі. Прыкладна ў 1516 г. запалоцкі паркан быў перанесены бліжэй да Верхняга замка [1, с. 28], у 1533 г. дворышчы па-за межамі новых гародняў былі закінуты, а на іх месцах размясціліся агароды, гумны і ралля. Як адзначалі рэвізоры ў 1533 г., «межи старыхъ перекоповъ и нынешнихъ остроговъ, на колько сотъ дворышъ, на которыхъ еще знати печыща и погребы старые, где домы были … а теперечы ... одно огороды и пашни и гумна на тыхъ местехъ мещанъские суть» [9, с. 194]. Адлегласць, якая пралягла ад новага да старога паркана, вызначалася ў некалькі палётаў стралы. За часам ваяводства Станіслава Давойны (1542–1563 гг.) паркан Запалоцкага пасада быў зноў перанесены далей ад Замка, але ўсё роўна так і не дасягнуў мяжы 1501 г. [1, с. 28]. Аднак наўрацці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нават у самыя неспрыяльныя часы плошча Запалоцкага пасада была меней за 17 га.

Прывілеем 1498 г. вялікага князя Аляксандра бернардзінцам дазвалялася жыць у Полацку на ўчастку горада, які размешчаны пад Верхнім замкам ва ўсходняй частцы Запалоцкага пасада [4, с. 41–42]. Асноўным аргументам для абрання дадзенай тэрыторыі было, па-першае, блізкасць да Верхняга замка, па-другое, пражыванне на Запалоцкім пасадзе найбольшай колькасці вернікаў каталіцкай канфесіі. Менавіта ўсходняя частка Запалоцкага пасада, як найбольш абароненая (побач знаходзіліся крапасныя сцены Верхняга замка), выдатна падыходзіла да будаўніцтва драўлянага Бернардзінскага кляштара ў неспакойны час ваеннага ліхалецця.

Такім чынам, адкрыццё набора кафлі першай паловы XVI ст. па вул. Краснова, 12 у г. Полацку дазваляе пацвердзіць меркаванне пра размяшчэнне Бернардзінскага кляштара XV – першай паловы XVI стст. ва ўсходняй частцы Запалоцкага пасада (у 1563 г. Бернардзінскі кляштар спыняе сваё існаванне, у 1696 г. бернардзінцы вяртаюцца ў Полацк па запрашэнню ваяводы Д.Сангушкі і будуюць спачатку драўляны, а потым і мураваны кляштар ў Задзвінні, у т. зв. Слабадзе Кабак, на левым беразе Дзвіны). Выява манаграмы Божай Маці на каронкавай кафле сведчыць пра каталіцкае веравызнанне ўладальніка печы. Гэтая печ магла знаходзіцца ў доме ганзейскага гандляра альбо святара-бернардзіна. У любым выпадку, ганчар, які рабіў кафлю, і пячнік, які клаў печ, наўрацці былі мясцовага (полацкага) паходжання: такога роду навацыі ў першай палове XVI ст. у Полацку яшчэ не былі засвоены на ўзроўні мясцовай рамеснай вытворчасці. Гэтыя майстры маглі быць запрошаны ў Полацк з гарадоў Ганзейскага саюзу, магчыма, з Рыгі. Геральдычная выява манаграмы Божай Маці на карнізнай кафле з адкрытага пячнога набора з'яўляецца пакуль што самым раннім прыкладам выкарыстання «гербавай» кафлі ў Полацку.

Літаратура

1. Варонін В.А. Сацыяльна–эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя: Дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. Мн., 2000. 109 с.
2. Дук Д. Камни из саги о Тидрике Бернском // Родина. 2006. № 10. С. 44–46.
3. Дук Д.У. Археалагічная разведка на Запалоцкім пасадзе Полацка ў 2003 г. // Древности Беларуси и в системе межкультурных связей / Материалы по археологии Беларуси, Вып. 11. – Минск: ГНУ «Институт истории НАН Беларуси», 2006. – С. 104–113.
4. Дук Д.У. Лакалізацыя асобных тапаграфічных аб'ектаў Полацка XVI–XVIII стст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 6. – С. 37–43.
5. Дук Д.У. Полацкая кафля XIV – сярэдзіны XVI стст. // Гістарычна–археалагічны зборнік. – 2001. – № 16. – С. 167–173.
6. Заяц Ю.А. Заслаўская кафля / Пад рэд. Г. В. Штыхава. - Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 62 с.: іл.
7. Клімаў М.В. Матэрыялы да рэканструкцыі печаў з посудападобнай кафлі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі: Навук. збор. / Нав. рэд.: А.М. Мядзведзеў. – Мінск: "ННАЦ" імя Ф. Скарыны, 2003. № 7. – С. 148–154.
8. Полная энциклопедия символов / Сост. В.М.Рошаль. – М.: Эксмо; СПб.: Сова, 2003. – 528 с., илл.
9. Справы полацкага гродзскага суда 1533–1539 гг. / Беларускі архіў. Т. 2. Мн., 1928. – 344 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




1




2

Мал. 1. План размяшчэння калодзежа ў Запалоцці (1) з прывязкай да мясцовасці (2)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 2. Кафля сценавая (1-3) і гаршковая (6-7)



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 3. Сценавая кафля

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 4. Карнізная кафля

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова